# Нашы юбіляры

## АРКАДЗЬ ІОСІФАВІЧ НАРКЕВІЧ



Вядомаму беларускаму мовазнаўцу, члену Саюза журналістаў СССР Аркадзю Іосіфавічу Наркевічу споўнілася 60 гадоў. Нарадзіўся ён 10 сакавіка 1929 года на Капыльшчыне, што дала нашай нацыянальнай культуры нямала бліскучых талентаў — пісьменнікаў, вучоных, грамадскіх дзеячаў, вучыўся ў Цімкавіцкай сярэдняй школе, якую скончыў у 1947 годзе. Сам «клімат» гэтага кутка Беларусі прадвызначыў яму шлях у філалогію — займацца вывучэннем і распрацоўкай роднай мовы. Пасля сканчэння школы ён паступае на аддзяленне беларускай мовы і літаратуры Мінскага педагагічнага інстытута імя А. М. Горкага, актыўна ўключаецца ў збор матэрыялаў для дыялекталагічнага атласа беларускай мовы, праца над якім як раз распачалася ў навуковых установах рэспублікі, выступае з дакладамі ў лінгвістычных гуртках. Скончыўшы інстытут, на працягу года працуе настаўнікам Грэскай сярэдняй школы на Случчыне, а з 1952 года становіцца аспірантам Інстытута мовазнаўства АН БССР. У 1956 годзе ён абараняе кандыдацкую дысертацыю на тэму «Спосабы выражэння азначэнняў у сучаснай беларускай літаратурнай мове». У тыя гады інстытут прыступіў да стварэння фундаментальнай граматыкі беларускай мовы. У калектыў стваральнікаў граматыкі ўвайшоў і Аркадзь Іосіфавіч. Вынікам працы над ёю з'явіўся выхад спачатку трохтомнага «Курса сучаснай беларускай літаратурнай мовы» (1957—1961), а затым «Граматыкі беларускай мовы» ў двух тамах (1962—1966). Уклад Аркадзя Іосіфавіча ў гэтыя публікацыі — каля 25 друкаваных аркушаў. Вызначыўся галоўны напрамак яго навуковых заняткаў — марфалогія і сінтаксіс сучаснай беларускай мовы. Разам з тым у Аркадзя Іосіфавіча выявілася цяга і да педагагічнай дзейнасці. Працуючы ў інстытуце, ён адначасова вядзе курс сучаснай беларускай мовы ў Беларускім дзяржаўным універсітэце імя У. І. Леніна, а ў 1965 годзе канчаткова пераходзіць на працу ва універсітэт на кафедру беларускай мовы. З арганізацыяй ва універсітэце ў 1969 годзе кафедры стылістыкі і літаратурнага рэдагавання ён размяркоўваецца на гэту кафедру, дзе працуе і зараз.

За гады працы ва універсітэце Аркадзь Іосіфавіч назапасіў вялікі педагагічны вопыт, вырас у аднаго з вядучых выкладчыкаў факультэта журналістыкі, абараніў у 1973 годзе доктарскую дысертацыю, атрымаў вучонае званне прафесара, набыў усеагульнае прызнанне як таленавіты педагог і даследчык беларускай мовы. Ён аўтар звыш 150 навуковых прац, сярод якіх манаграфіі «Сістэма словазлучэнняў у сучаснай беларускай мове» (1972) і «Назоўнік. Граматычныя катэгорыі і формы» (1976), вучэбны дапаможнік «Практыкум па курсу «Сучасная беларуская літаратурная мова» (1983), шэраг артыкулаў па пытаннях культуры мовы, шматлікія рэцэнзіі і водгукі на працы іншых даследчыкаў.

Аркадзь Іосіфавіч выконвае вялікую грамадскую работу. На працягу многіх гадоў ён узначальваў партыйную і прафсаюзную арганізацыі факультэта журналістыкі, выбіраўся ў мясцовы камітэт універсітэта. Зараз ён з'яўляецца членам спецыялізаваных саветаў па лінгвістыцы пры універсітэце і Інстытуце мовазнаўства імя Я. Коласа АН БССР, старшынёй факультэцкай метадычнай камісіі, часта выступае па розных лінгвістычных пытаннях у рэдакцыях газет і часопісаў, перад шырокай грамадскасцю, па радыё і тэлебачанню. Яго заслугі перад навукай і вышэйшай школай адзначаны нагрудным знакам «За выдатныя поспехі ў працы», граматамі Міністэрства народнай адукацыі рэспублікі і рэктарата універсітэта.

Сёлета Аркадзь Іосіфавіч узначаліў кафедру стылістыкі і літаратурнага рэдагавання. Пажадаем яму поспехаў у кіраўніцтве кафедрай, добрага здароўя і новых творчых дасягненняў.

**Л. М. Шакун**

# ДЗМІТРЫЙ ЯКАЎЛЕВІЧ БУГАЁЎ



Споўнілася 60 гадоў Дзмітрыю Якаўлевічу Бугаёву — вядомаму крытыку і літаратуразнаўцу, лаўрэату Дзяржаўнай прэміі БССР імя Якуба Коласа, члену праўлення Саюза пісьменнікаў БССР, прафесару кафедры беларускай літаратуры Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна. Нарадзіўся ён 12 студзеня 1929 года ў вёсцы Сычык Крычаўскага раёна Магілёўскай вобласці ў сялянскай сям'і. У першыя пасляваенныя гады скончыў педагагічнае вучылішча, настаўнічаў, затым вучыўся ў Магілёўскім педагагічным інстытуце, а потым — у аспірантуры пры Мінскім педагагічным інстытуце імя М. Горкага.

Дзмітрый Якаўлевіч працаваў выкладчыкам Мазырскага педагагічнага інстытута (1955—1959) і адначасова займаўся навуковай, літаратурна-крытычнай дзейнасцю. З 1957 года актыўна выступае ў друку з артыкуламі, рэцэнзіямі. У 1959—1964 гадах ён — навуковы супрацоўнік Інстытута літаратуры імя Янкі Купалы Акадэміі навук БССР, дзе абараняе кандыдацкую дысертацыю «Проза Міхася Лынькова 20-х — пачатку 30-х гадоў».

З 1964 года Дз. Я. Бугаёў — на кафедры беларускай літаратуры БДУ імя У. І. Леніна. Ужо шмат пакаленняў выпускнікоў універсітэта з удзячнасцю прыгадваюць ягоныя змястоўныя, высокакваліфікаваныя лекцыі і практычныя заняткі. Ім падрыхтаваны дзесяткі маладых вучоных, кандыдатаў філалагічных навук.

Шырокую вядомасць набылі даследаванні Дз. Бугаёва пра творчасць Міхася Лынькова («Шчодрае сэрца пісьменніка», 1963), Максіма Танка («Паэзія Максіма Танка», 1964), Кандрата Крапівы («Зброяй сатыры, зброяй праўды», 1971), Івана Мележа («Вернасць прызванню», 1977), Васіля Быкава («Васіль Быкаў. Нарыс жыцця і творчасці», 1987). Варта асобна адзначыць кнігі пра тых пісьменнікаў, чые імёны былі з ягонай дапамогай вернуты ў літаратуру пасля доўгага незаслужанага забыцця: «Уладзімір Дубоўка» (1965) і «Максім Гарэцкі» (1968). Дз. Бугаёў з'яўляецца адным з аўтараў двухтомнай «Гісторыі беларускай савецкай літаратуры» (1964—1966), падручнікаў па беларускай літаратуры для ВНУ.

Глыбокім адчуваннем сучаснасці, грунтоўнасцю ацэнак, вернасцю духу перабудовы вызначаюцца яго навуковыя даследаванні апошніх гадоў. Колькі маладых беларускіх пісьменнікаў і паэтаў блаславіў ён у літаратуру, колькі талентаў адкрыў, падтрымаў сваімі дабразычлівымі водгукамі ў друку! Дзмітрый Якаўлевіч заўсёды выступае як прынцыповы, уважлівы, праніклівы крытык. Ён быў адным з тых, хто, паводле слоў І. Чыгрынава, «узяў на сябе смеласць сказаць на ўвесь голас, **што** ёсць **што** ў паэзіі, прозе, драматургіі і **хто** ёсць **хто** ў нашай літаратуры».

Лепшыя артыкулы даследчыка змешчаны ў зборніках «Шматграннасць» (1970), «Талент і праца» (1979), «Чалавечнасць» (1984). Апошні з іх адзначаны Дзяржаўнай прэміяй БССР імя Якуба Коласа.

Дз. Бугаёў прымае актыўны ўдзел у літаратурна-грамадскім жыцці. Ён — член савета па крытыцы і літаратуразнаўству Саюза пісьменнікаў СССР, член рэдкалегіі часопіса «Полымя», выдавецтва «Народная асвета», старшыня рэспубліканскага міжвузаўскага метадычнага аб'яднання выкладчыкаў беларускай літаратуры, намеснік старшыні камісіі па сувязі са школай СП БССР.

Наш паважаны юбіляр — у росквіце творчых сіл, пра што сведчыць падрыхтаваны ім зборнік літаратурна-крытычных артыкулаў «Арганічнасць таленту», які неўзабаве выходзіць у свет. Пажадаем жа Дзмітрыю Якаўлевічу плёну ў працы, добрага здароўя, здзяйснення творчых задум.